мастацтва

Галіна Багданава



...гэтым творам ня трэба твараў,
яны самі твары вечнасьці...

# Дуэт

***Нараджэньне Васюковай Венеры.***

— Венеры-Тамары, — скажуць тыя, хто іх ведае.

— Васючыхі, — удакладнілі б, калі б засталіся яны жыць на Палесьсі.

— Тамары Янаўны, — сьветла ўздыхнуць тыя, каго яна вучыла і вучыць мастацтву керамікі ў Беларускім універсітэце культуры.

...Як у хвіліны пяшчоты называе яе Валодзя спытаць не рашылася.

Кожны мужчына люляе ў думках і мроях сваю Венеру. У эпоху Раньняга Адраджэньня італьянцу Батычэлі «Нараджэньне Венеры» убачылася ў спакусьліва-ўзьнёслым уздыху імклівых марскіх хваляў. Венера, зрэшты, паводле легенды, так і нарадзілася. Было гэта даўным-даўно, яшчэ ў дагістарычную эпоху, калі неба толькі-толькі аддзялілася ад зямлі. Калі стыхіі абагаўляліся, а богі ачалавечваліся. І ў тую самую, асьвечаную міфамі богатворную пару, шмат тысячагоддзяў да нашай эры ў розных кутках нашай пла-

неты безыменныя мастакі, не згаворваючыся, пачалі выразаць з косьці і ляпіць з гліны бястварых аголеных дзяўчын, акцэнтуючы ў іх тыя часткі цела, якія найперш адказваюць за працяг роду. Пазьней археолагі назвалі іх Венерамі. Спачатку чалавек пераўвасобіў жывёлу, потым – жанчыну, а ужо значна пазьней сябе самога, мужчыну — мастака і паляўнічага. У кожнага племені быў свой ідэал. Венера з Вілендорфу – быццам налітая сокам, круглявая, ды што там, па нашым мерках, тоўстая. Венеры з Елісеевічаў больш грацыёзныя і пластычныя... Ідэал прыгажосьці быў для першабытнага чалавека знакам пладнасьці, знакам урадлівасьці, знакам жыцьця.

Яшчэ ня так даўно, напрыканцы XX стагоддзя абарыгены аднаго з астравоў у Ціхім акіяне ляпілі такія фігуркі з гліны і клалі іх на ўскрайку поля, каб яны, размытыя дажджом, надавалі полю сілы, каб зерне ўрадзіла.

Сёньня Тамара Васюк у сваёй майстэрні чаруе (іншага слова ня знойдзеш!) над сваёю архаічнаю Венерай, дакладней Венерамі. Венерамі, якія маглі б стаць ня толькі яе, але ж, пэўна, і Валодзіным ідэалам. Хаця ён, Уладзімір Васюк больш вядомы ў рэспубліцы і за яе межамі ня як выпускнік аддзяленьня керамікі, а як выдатны плакатыст, мастак-графік. Васюкі. Тамара і Валодзя. Пры іхнім нават чыста зьнешнім падабенстве (яны – карэнныя палешукі), кожны з іх застаецца яркай творчай індывідуальнасьцю.

### Вяртаньне ў будучыню.

...Гэтым творам ня трэба твараў. Яны самі – твары вечнасьці. Разрэзаная напалам шурпатая шкарлупка вялізнага, на паўстала глінянага арэхаформы хавае ў сабе таемны зьмест: сакавітае ядро, старажытную пасудзіну – гаршчок з завостраным донцам і няроўным, зьедзеным часам, бы толькі



*Тамара ВАСЮК.*

з археалагічнага раскопу венчыкам. Але варта прыгледзецца, і ў той пасудзіне бачыш ледзь пазначаныя рэльефам абрысы жаночага цела, нясканчаны торс палеалітычнай Венеры са сьлюдзянымі бліскаўкамі на баку...

А старажытныя карчагі (пасудзіны з шыйкай і вушкамі), форму якіх таксама пераасэнсоўвае Тамара, і зусім падобныя на жаночыя постаці.

Яна, майстар, пяшчотна праводзіць па шыйцы-таліі яшчэ цёплай пасьля абпалу Венеры... І я адчуваю, што гэта ёсьць нешта большае, чым проста жанчына. У гэтай форме няма пустаты. Яна хавае ў сабе рэха ўсёй нашай гісторыі.

На вакне – цэлыя папкі ксеракопіяў археалагічных знаходак з розных частак сьвету і, вядома ж, найперш з Беларусі. Якія яны ўсе розныя і якія часам падобныя! Недзе глыбока ў гісторыі, на неспазнаным яшчэ, карэнным узроўні і трэба шукаць усім нам ключ да узаемаразуменьня. Дзіўна, чым выразьней «самасьць» вобразу, тым бліжэй ён да «юнгаўскага» калектыўнага падсьвя-



*Уладзімір ВАСЮК.*

домага, да архетыпу, які ўспрымаецца намі на ўзроўні падсьвядомасьці.

Сама Тамара пра новыя свае творы кажа:

— Архаіка...

І дадае:

— Некаторыя вучоныя сьцьвярджаюць, што XXI стагоддзе будзе стагоддзем архаікі.

Чым жа яна, архаіка, вабіць сучасных мастакоў? Што шукаюць яны ў вобразах, створаных за дзесяткі тысячагоддзяў да іх нараджэньня? Можа быць, ёсьць надзея там, за даляглядам вечнасьці адшукаць найпростыя адказы на вечныя пытаньні? А што, калі нашыя продкі лепш за нас ведалі, што ёсьць космас і што ёсьць чалавек? Чаму так розьняцца мужчына і жанчына?

Рускі філосаф Мікалай Бярдзяеў дакладна вызначыў: «У сьветапарадку мужчынскае і ёсьць пераважна антрапалагічны, чалавечы пачатак, жаночае – пачатак прыроды, касьмічны. Мужчына – праз жанчыну зьвязаны з прыродай, з космасам, па-за жаночым ён быў бы адрэзаны ад душы сьвету, ад маці-зямлі. Жанчына па-за сувязьзю з мужчынскім не была б цалкам чалавекам, у ёй занадта моцная цёмная прыродная стыхія, безасабовая і несьвядомая».

І калі ўявіць сумесную выставу твораў Тамары і Уладзіміра Васюкоў, то Тамара, яе Венеры, будуць якраз увасабляць натуральную прыродную гармонію, космас, душу сьвету і маці-зямлю. Пустэча, цемра ў глыбіні пасудзіны ці ня ёсьць тая самая цёмная прыродная стыхія? А Уладзімір Васюк пераасэнсоўвае ў вобразах-сімвалах, калі можна так сказаць, сьляды чалавека на гэтай зямлі. Сьляды, якія пакідае пасьля сябе і кожны з нас паасобку, і цэлы народ. І ўся нашая цывілізацыя... Чаша, цярновы вянец, рог Рагвалода. Сімвал усеагульны, сімвал хрысьціянскі, сімвал наш...

І ня толькі ва ўласнай творчасьці, але і ў вучнях сваіх – выпускніках аддзяленьня народных рамёстваў Беларускага універсітэту культуры, дзе выкладае Тамара і аддзяленьня рэкламы Беларускай акадэміі мастацтваў, дзе выкладае Уладзімір, Васюкі, ізноў жа быццам пазначаюць два, здавалася б, супроцьлеглыя накірункі разьвіцьця нашай культуры.

Выхаванцы Тамары паказваюць кампазіцыі з керамікі, дзе ў сучаснай стылістыцы пераасэнсоўваюцца традыцыйныя сьвяты, вобразы язычніцкіх багоў. Яны бачаць у камянях абрысы анёлаў і надаюць крыжам падабенства з людзьмі. Дыпломныя ж праекты, кіраўніком якіх зьяўляецца Уладзімір, — гэта суперсучасныя, часта выкананыя з дапамогай кампутара, плакаты ці прапановы па афармленьні ўстановаў, крамаў.

Дыпломнікі Тамары і Валодзі Васюкоў заўжды дэманструюць выдатны, бездакорны густ, яны маюць пачуцьцё меры, ведаюць, адчуваюць, што ёсьць гармонія ліній, колераў, пластыкі. І яшчэ дыпломныя праекты, ля якіх разам са студэнтамі чаравалі Тамара і Валодзя вельмі нашыя, беларускія і адначасова – еўрапейскія. Яны – тра-

дыцыя. Яны – сучаснасьць. А значыць – будучыня...

**Хутаранка.**

Каб увасобіць голас сваёй зямлі, яго спачатку трэба пачуць. Гучней за ўсё зямля нашая прамаўляе на Купальле, тады, калі якраз і зьявілася на сьвет Тамара.

— Я родам з Гомельшчыны, з вёскі Хутаранкі, — расказвае яна і ўслухоўваецца як бы нанова чуе знаёмыя з маленства словы, — Хутар Янкі... Да фанатызму адчуваю сувязь з роднай зямлёю, з дзядамі. Яны былі крыштальна чыстыя людзі... А маці мая з Жураўлёўкі... Чуеце, прыгажосьць, хараство якое ў саміх назвах... Валодзя таксама з Гомельшчыны, з Хойніцкага раёну, з пасёлку Леніна... Мы з ім палешукі. Гэтым шмат што сказана...

Дзіўна, (але хай гэта будзе добры знак!), гаворка нашая пачалася не з напаміну пра Чарнобыль, а з успаміну пра аднаго з новых нашых сьвятых – сьвятара з Кармы Іаана Блажэннага.

Тамара нагадала:

— Ён усіх прасіў рабіць толькі дабро. Шанаваць адно аднаго. Толькі так можна ўратаваць сваю душу. Вось якія у нас з Валодзем землякі.

— А маляваць пачалі са школы? – пытаюся.

— Мяне падахвоціў стаць мастаком мой настаўнік матэматыкі – Іван Мартынавіч Харкоў (я скончыла Пясочна-Будскую школу). Ён чарціў на дошцы і тлумачыў, што за кожнай лініяй і геаметрычнай фігурай ёсьць прастора. Дасюль вельмі люблю гэтае слова – Прастора. Ён навучыў мяне бачыць усё аб'ёмна, цэласна.

—Але ж, каб займацца маляваньнем, наколькі памятаю, езьдзіць даводзілася ажно ў Гомель...

— Так, у пяць раніцы ўставала, чатыры кіламетры праз лес да чыгункі, а там – да Гомелю... У Гомелі, як мы казалі «пад купалам князя Паскевіча» займаліся і юныя музыкі, і юныя мастакі. Маім першым настаўнікам у мастацтве быў Валянцін Пятровіч Пакаташкін.



*Т.Васюк. Купалінка.*

— Вы ж тады былі зусім юнай. Не баяліся адна, цёмначы, праз лес...

— Мама за мяне вельмі хвалявалася. А баба Апанасіха супакойвала: «Ідзі, Ідзі... Я за цябе памалюся». І, праўда, як усё адно мяне штосьці ахоўвала. Баба Апанасіха, дарэчы, да 99 гадоў дажыла. Адна ў хаце. І з чысьцейшаю памяцьцю. Кажуць, памяць звязана з сумленьнем. Чыстае сумленьне – чыстая памяць.

**Сустрэча.**

На плоскасьці паралельныя не сустракаюцца. А ў прасторы, у прасторы вялікага гораду, сталіцы, у прасторы Менскай мастацкай вучэльні імя Глебава, куды Тамара паступала два разы, а Валодзя, ужо з арміі, трэці, — яны сустрэліся. Так трэба было. Трэба



*Т.Васюк. Капліцы.*

было, каб абодва яны трапілі ў майстэрню да цудоўнага мастака і педагога Дубара, які да самазабыцьця любіў пяшчотны, мяккі жывапіс Бялінскага-Бядулі. Ён вучыў слухаць сваю зямлю, пісаць не фарбамі – душою. І, пэўна ж, добра ведаючы, ды што там, нават адчуваючы кожнага са сваіх вучняў, менавіта настаўнік аднойчы зірнуў на Тому з Валодзем і сказаў:

—А вы пажэніцеся!..

У 2002 годзе Валодзя і Тома адзначылі трыццаць гадоў сумеснага жыцьця.



*Т. Васюк. Музыка.*

Любімы настаўнік, Дубар, дапамог ім, пасьля паступленьня на аддзяленьне керамікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытуту (цяпер – Беларускай Акадэміі мастацтваў), уладкавацца мастакамі-афармляльнікамі ў Ленінскую (цяпер – Нацыянальную) бібліятэку. Валодзя з Томай адпрацавалі там каля сямі гадоў. Дзякуючы таму, што ў іх была майстэрня, ды яшчэ ў цэнтры гораду, нават нараджэньне сына (ён цяпер біёлаг) не спыніла іх самых дзёрзкіх творчых пошукаў.

Тамара, абараніўшы дыплом (гэта былі экстэр'ерныя скульптуры «Дзяды»), пайшла працаваць у эксьпэрыментальную лабараторыю па жалезнай фурнітуры. А Валодзя захапіўся графікай. Пачалі зьяўляцца цэлыя нізкі ягоных плакатаў. Шэкспір, Колас, Купала, экалагічная тэма... Прычым, экалогія прыроды хвалявала Валодзю гэтаксама востра, як і экалогія душы, выток якой у гістарычнай памяці, культуры, мове свайго народу...

На пачатку 1980-х гадоў імя Уладзіміра Васюка мастацвазнаўцы ўпэўнена паставілі ў шэраг самых яркіх асобаў у беларускім плакаце: Захава, Крукоўскі, Стома, Васюк...

**Вечны пошук.**

— Нам шанцавала на настаўнікаў. У вучылішчы – Дубар, у тэатральна-мастацкім інстытуце – Угрыновіч (гэта ён навучыў мяне гліне), Раманюк. Гэта людзі, што прыцягвалі дабро – і думкамі, і словамі, і памкненьнямі...

Тамара на імгненьне задумалася...

— Але для мяне асабіста сапраўдным адкрыцьцём была сустрэча з выдатнай латышскай керамісткай Олітэ Абалінэ, якая працавала бібліятэкарам, а ў вольны час ляпіла. Калі я ўбачыла яе ўпершыню (ёй было тады 50, мне каля 30), яна уразіла мяне незвычайна. Магутная, цэльная асоба.

Гавару з Тамарай, і лаўлю сябе на думцы: «Зараз гэтаксама захапляюцца ёю самою яе студэнты і студэнткі». І сьвяты ганчарства ў нас цяпер ладзяць,

як і яшчэ ў 1980-ыя ў Латвіі. Мне пашчасьціла быць на адным з такіх сьвятаў у Латгаліі... З конкурсам майстроў, народнымі танцамі, сьпевамі, да якіх далучаліся праз нейкі час і госьці. Можа быць, там, у Латвіі, я ўпершыню адчула, што Майстар, Ганчар – гэта не гісторыя, гэта сучаснасьць і будучыня. Хто ж, як не ганчар, стварае падобна да Бога з гліны новую рэальнасьць?! Цяпер і ў нас, на Беларусі, ладзяць сьвяты ганчароў, і Тамара Васюк там ня толькі шаноўны госьць, але і член журы...

Ня ўсе, нават ганчары, ведаюць,



Т. Васюк. Барбара Радзівіл.

што, калі лепіш, трэба ўмець кіраваць дыханьнем, супыняцца на выдыху. Тамара Васюк вучыць гэтаму тых, хто сёньня прыходзіць да яе ў «Майстарклас». Яна вельмі любіць выраз «сапыніся імгненьне!», значыць, «замры!», дай угледзецца, палюбавацца.

Для яе, Тамары, гэткім цуд-імгненьнем была сустрэча з Олітэ Абалінэ. Для мяне – выстава габелену і керамікі, што была наладжаная ў 1985 годзе ў Заслаўі. На той час у будынку Спаса-



Ул.Васюк. Вечнасьць.

Прэабражэнскай царквы разьмяшчаўся музей. А выставачнай залаю былі сутарэньні і вежа. Уздымаешся па прыступках і, паверх за паверхам, зала за залаю, аглядаеш экспазіцыю. Габелены Галіны Крываблоцкай, Валянціны Бартлавай, кераміка Лявона Панамарэнкі, Тамары Васюк... Былі і яшчэ ўдзельнікі, і яшчэ творы... Але цяпер лягчэй за ўсё згадваюцца яе, Тамарыны кубкі, медалі, увасобленая ў кераміцы пластыка народных строяў і , галоўнае, «Белая», «Срэбраная»...

Скульптуры, якія так натуральна глядзеліся ў, як быццам сьпецыяльна для іх прыдуманых старажытных нішах... У іх, гэтых скульптурах ужо было прадчуваньне вобразаў Еўфрасіньні Полацкай, Барбары Радзівіл, якіх значна пазьней, ужо на мяжы XXI стагоддзя ўвасобіла Тамара Васюк. У іх было прадчуваньне вабных, пластычных торсаў, кожны з якіх – верш, песьня, паэзія... У іх было прадчуваньне і гэтых дзіўных архаіч-



Ул.Васюк. Стоды.

ных Венераў, якія доўгі час нікуды за сьцены майстэрні не выходзілі...

Мы гаварылі і незаўважна ад таго, што было створана, перайшлі да таго, што страчана, незваротна страчана. Пайшлі з жыцьця незабытныя В. Угрыновіч і М. Раманюк, ня толькі настаўнікі, шчырыя сябры.

Няма ў Тамары цяпер і майстэрні, якую яна мела на Барысаўскім мастацкім камбінаце (колькі твораў там нарадзілася, колькі разумных думак было запісана па дарозе, у электрычцы, колькі вершаў сплыло пад аднастайныя сьпевы колаў электрычкі!). Дарэчы, праграму, паводле якой цяпер выкладае,таксама напісала ў дарозе.

І дасюль балюча ўспамінаць: ідзе яна па вуліцы Астроўскага, а насустрач ляцяць накіды, малюнкі, і яна з жахам разумее, што гэта іхнія з Валодзем накіды і малюнкі з абрабаванае, разбуранай майстэрні...

Але гэта нішто ў параўнаньні з тым, што Чарнобыль адабраў у палешукоў Бацькаўшчыну...




*Ул.Васюк Плакат «Ефрасіння Полацкая».*

**Выспа.**

І тады Тамара стварыла з гліны сваю выспу... Дзіўныя, паліваю расьпісаныя керамічныя кампазіцыі – Востраў На-дзеі.

Я хадзіла па выставе Тамары і Уладзіміра Васюкоў у Палацы мастацтва і адчувала, што я блукаю ва ўратаваным мастакамі сьвеце хараства і гармоніі, які не, не зьнікае, а толькі нараджаецца. Бо нават канец ёсьць пачатак новай рэальнасьці.

Яны такія падобныя і такія розныя.

Тамара, жанчына, у нейкім пазасьвядомым адчуваньні прасторы і часу, заглыбляецца ў гісторыю, быццам сама сябе суцяшае: жылі людзі тысячы гадоў да нас і жыць будуць праз тысячы пасьля нас, і Чарнобыль з небясьпечнае плямы ператворыцца ў ледзь заўважную радзімку...

А Валодзя, той не... Той пакутуе ў творах. Вобразы-сны не даюць спакою... Пасьля Чарнобылю ў ягоных графічных аркушах зьявілася нешта ірэальнае. Дастаткова згадаць нізку «Мая малая радзіма»... Тут лінія сьпявае, і лінія плача, і лінія маўчыць...

— Чыстая лінія, як чысты голас, — кажа Тамара, — у Валодзі гэта ёсьць.

І дадае:

— Можа радасьць жыцьця ад дэфіцыту жыцьця?..

Дык вось чаму ёй так хочацца даць шанц нарадзіцца яшчэ адной сваёй Венеры...

...Людзі пaглядзяць на яе і Валодзя пaглядзіць... І нешта зразумее.

Сапуніся імгненьне!..

Сапуніся...